32. *Шаланда, А.* Земскі суд Гарадзенскага павета ў 1555–1564 гг. / А. Шаланда // Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё, XV–XX ст.: зборнік матэрыялаў II Міжнароднай навуковай канферэнцыі, лістапад 2009 г., г. Гродна / пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Гродна, 2009. – С. 35–64

33. *Іванова, Л.* Гарадзенскі земскі суд у канцы XVI ст. у кантэксце Статутаў Вялікага Княства Літоўскага 1566 і 1588 гг. / Л. Іванова // Гарадзенскі міленіум: зборнік артыкулаў / уклад.: Н. Сліж. – Мінск: Гайсак, 2014. – (Arche Пачатак ; № 11 (132)). – С. 106–122.

34. *Вилимас, Д.* Ошмянский земский суд в 1564–1588 гг. / Д. Вилимас // Ашмяншчына: праблемы рэгіянальнай гісторыі Беларусі: зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск, 2011. – С. 128–135.

35. *Радаман,* А. Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства (другая палова XVI – першая палова XVII ст.) / А. Радаман, Д. Вілімас, В. Галубовіч // Commentarii polocenses historici= Полацкія гістарычныя запіскі: навуковы часопіс. – Наваполацк: Tomus Primus, 2004. – Том I. – С. 73–80.

36. *Радаман, А.* Земскія ураднікі Віцебскага ваяводства ў другой палове XVI – першай палове XVII стст. / А. Радаман, Д. Вілімас, В. Галубовіч // Commentarii polocenses historici = Полацкія гістарычныя запіскі: навуковы часопіс. – Наваполацк: Tomus Primus, 2005. – Т. II. – С. 51–61.

37. *Радаман, А.* Земскія ураднікі Гарадзенскага павета ВКЛ (другая палова XVI – першая палова XVII ст.) / А. Радаман, Д. Вілімас, В. Галубовіч // Павятовая шляхта ВКЛ: гісторыя, геральдыка, генеалогія, культура (XVI—XVIII ст.): матэрыялы навуковай канферэнцыі, Горадня, 18 лютага 2005 г. / рэд. А. Шаланда. – (Герольд Litherland; № 17). – Горадня, 2006. – С. 98–109.

38. *Галубовіч, В.* Кнігі запісаў метрыкі Вялікага Княства Літоўскага першай паловы XVII стагоддзя як крыніца па гісторыі Браслаўшчыны / В. Галубовіч // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 935-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах (Браслаў, 27–28 красавіка 2000 г.). – Браслаў, 2001. – С. 22–25.

**(Дата падачы: 27.02.2018 г.)**

*П. Ю. Булаты*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*P. Bulaty*
Republican Institute of Higher Education, Minsk

**УДК 94(4)**

# УЗНІКНЕННЕ І ЭТАПЫ ЭВАЛЮЦЫІ ТЭРМІНАЎ «ГРАФ» І «ГРАФСТВА» Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

# ORIGIN AND STAGES OF EVOLUTION OF THE TERM «COUNT» AND «COUNTIES» IN WESTERN EUROPE

*Артыкул прысвечаны тэме ўзнікнення тытула «граф» у Заходняй Еўропе. Паказаны працэс трансфармацыі паняццяў «граф» і «графства» ў еўрапейскай прасторы. У дадзеным працэсе можна вылучыць тры этапы: бюракратычны, феадальны, тытулярны. Кожны з іх мае свае адметнасці ў разуменні сэнсу арыстакратычнага тытула.*

*Ключавыя словы: тытул; граф; графства.*

*The article is dedicated to the history of establishment of counties in the territory of Western Europe. The transformation process of earldom in European area is shown. This process can be divided into three stages: the bureaucratic, feudal, titular. Each of them has its own characteristics in the understanding of the meaning of an aristocratic title.*

*Key words: title; count; county.*

Цягам стагоддзяў у Заходняй Еўропе знаць адыгрывала значную ролю ў жыцці грамадства розных краін. У гістарыяграфіі тэмы, звязаныя з даследаваннем прывілеяванага саслоўя, не згубілі сваёй значнасці і актуальнасці, што абумоўлена важнай роляй асэнсавання палітычных і эканамічных формаў арганізацыі жыцця мінулых эпох у працэсе сучаснага дзяржаўнага будаўніцтва. Адметнай рысай арыстакратыі Заходняй Еўропы з'яўлялася наяўнасць тытулаў, якія выбудоўвалі складаную прыступкавую саслоўную іерархію. Адным з тытулаў, які быў распаўсюджаны ў саслоўных лесвіцах розных еўрапейскіх краін, з'яўляўся тытул «граф» і злучаная з ім назва маёнтка «графства».

У айчынай гістарычнай традыцыі набылі распаўсюджанне формы «граф» і «графства», якія прыйшлі на землі Вялікага Княства Літоўскага са Святой Рымскай імперыі. Карані слова «граф» (старабеларускія формы, якія падаюцца ў гістарычным слоўніку беларускай мовы: *«кграбя»*, *«грабя»*, *«кграбе»*, *«крабя»*, *«кграфъ»*, *«кгрофъ»* [1, с. 337]) паходзяць ад нямецкага слова «Graf», якое ў сваю чаргу мае дачыненне да старажытнаверхненямецкай формы «grafio» і «gravo». Германскае слова ўжывалася для перакладу лацінскага «comes» (спадарожнік; у Сярэднявеччы абазначала «спадарожнік караля»). Самі ж нямецкія формы паходзяць ад сярэднелацінскага слова «graffio» і грэчаскага «γραφεύς (grapheus)», што азначае «пісар, рэгістратар» [2–6]. Лацінскі тэрмін «graffio», пераняты ў нямецкую мову, упершыню сустракаецца ў разнастайных артыкулах прававога кодэксу «Салічная праўда» [7, с. 192, 194, 195, 292]. Першапачатковае значэнне тэрмінаў «граф» і «графства» тлумачыцца іх сэнсавай трансфармацыяй, якая адбывалася ў Заходняй Еўропе цягам стагоддзяў. У дадзеным працэсе можна вызначыць тры этапы.

Першы этап у развіцці тэрмінаў «граф» і «графства» акрэслім як «бюракратычны». Тэрмін «граф» у гэты час ужываецца ў якасці вызначэння пэўных дзяржаўных пасад, а «графства» – адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Вылучаны перыяд ахоплівае эпохі позняй Антычнасці і ранняга Сярэднявечча – ад 312 г. н.э. да IX ст. Упершыню ў бюракратычным сэнсе тытул «граф» (лац. «comes») з'яўляецца ў Рымскай імперыі ў 312 г. н. э. [8, с. 485]: ён абазначае асабістага дарадцу ці падначаленага імператара. Дадзенае афармленне адбылося ў часы кіравання імператара Канстанціна I. Сэнсавае напаўненне гэтага тэрміну падкрэслівае сувязь носьбіта тытула з імператарам ці яго дваром. З другой паловы III ст. н. э. тэрмін «comes» выкарыстоўваўся для вызначэння ўрадавых асоб розных рангаў, ахопліваючы розныя сферы дзяржаўнага ўладкавання. Напрыклад, *Comes palatinus* – суддзя вышэйшага рангу. У якасці ганаровай пасады тытулам «comes» былі ўшанаваныя некаторыя з прадстаўнікоў дзяржаўных чыноўнікаў высокага рангу – *Magister officiorum*

(загадчык палацавай адміністрацыі) і *Quaestor* (дапаможнікі консулаў). У той жа час у дзяржаўным апараце існавалі такія бюракратычныя наміналы, як *Comes sacrarum largitionum* (Коміт святых шчадротаў; фінансавы ўраднік) і *Comes rerum privatarum* (чыноўнік, які кіраваў эксплуатацыяй і зборам даходаў з дзяржаўнай і прыватнай маёмасці імператара) і інш. Да вышэйшага эшалону ўлады былі залічаныя і іншыя *Comes*-пасады, якія не ўваходзілі ў склад Кансісторыя (адміністрацыйна-дарадчы орган пры імператары). Сярод іх можна адзначыць, напрыклад, *Comes Africae* і *Comes Aegypti* – правінцыяльныя адміністратары, якія выконвалі фіскальныя і эканамічныя функцыя, дзейнічалі ў якасці кантралёраў. У больш позні час (IV–V стст. н. э.) выкарыстоўвалася грэчаская форма тэрміна (γραφεύς (grapheus)) для вызначэння пэўных дзяржаўных пасад з рознымі функцыямі [9, 10, с. 104–106, 11].

У Сярэднявеччы графствы з'яўляліся адзінкамі абласнога падзелу ў Франкскай дзяржаве і ў Англіі. Каралі дынастыі Меравінгаў, усталёўваючы лад сваёй дзяржавы, карысталіся абласнымі дзяленнямі, якія ўжо існавалі за часамі Рымскай імперыі (гарадскія акругі, або *civitates*) [3]. Падобныя ж гарадскія акругі ўтвараліся і ў чыста германскіх землях, або ў аснову дзяленняў закладваліся тэрыторыі, раней занятыя асобнымі дробнымі плямёнамі. Усе гэтыя акругі пастунова прымалі характар аднастайных адміністрацыйна-судовых, фінансавых і ваенных адзінак дзяржавы, на чале якіх стаяў граф. На пачатку IX ст. граф вызначаўся як службовая асоба, якая прадстаўляла ўладу караля на падначаленых землях [4, 5]. Тэрміны «граф» і «графства» асабліва пашырыліся і ўвайшлі ва ўжытак у IX ст. у эпоху караля Карла Вялікага. Дадзеныя дэфініцыі згадваюцца ў знакамітых каралеўскіх Капітулярыях (параграфе 27 Капітулярыя аб маёнтках [12]). Створаная Карлам Вялікім Імперыя франкаў патрабавала рэарганізацыі і наяўнасці трывалага адміністрацыйнага апарата. Кароль імкнуўся стварыць моцную цэнтралізаваную дзяржаву, якой кіраваў разгалінаваны апарат чыноўнікаў. Цэнтр апарата кіравання знаходзіўся пры Карле І у яго рэзідэнцыі. У складзе апарата, сярод іншых, узгадваецца пасада дварцовага графа (*Comte du palais*) – службоўцы, які дапамагаў каралю ў судовых справах, а таксама загадваў канцылярыяй [13]. Натуральна, што цэнтральны апарат не мог кіраваць усёй імперыяй дыстанцыйна. Таму па ўсёй краіне прысутнічалі мясцовыя чыноўнікі, якія складалі пэўную феадальную іерархію падобна той, што была сфармаваная ў цэнтры. На чале буйной адміністрацыйнай акругі стаяў граф, у яго былі памочнікі-вікарыі (віцэ-графы). На месцах граф меў шырокія паўнамоцтвы, яму таксама былі нададзены судовыя функцыі [14, 15].

Другі этап у развіцці паняццяў «граф» і «графства» можна акрэсліць як «феадальны» (IX–XV стст.). Іншае асэнсаванне гэтых паняццяў адбылося на фоне працэсу феадальнай раздробленасці, які, распачаты яшчэ пры Меравінгах, працягваўся ў канцы IX ст. Фармальнай кропкай адліку новага этапу ў разуменні тэрмінаў «граф» і «графства» з'яўляецца прынцце

ў 877 г. Карлам ІІ Лысым К'ерзійскага капітулярыя (*Capitulaire de Quierzy*). Гэты дакумент юрыдычна замацоўваў і санкцыянаваў палітычную самастойнасць графа, ператвараючы яго з дзяржаўнай урадавай асобы ў сеньёра сваёй акругі. Адным з важных палажэнняў К'ерзійскага капітулярыя было ўсталяванне спадчыннасці тытула графа [16, с. 355–361]. З цягам часу і з далейшым развіццём феадальных адносін графствы страцілі значэнне адміністрацыйных адзінак дзяржавы: пад гэтай назвай сталі разумець сукупнасць зямель, якімі валодала асоба з тытулам графа. Так, у Заходняй Еўропе ў X–XII стст. склаліся сярэднявечныя графствы (таксама княствы і герцагствы), якія з'яўляліся часта асобнымі феадальнымі адзінкамі, што прыйшлі на змену буйным палітычным дзяржаўным арганізацыям. Пасля распаду Імперыі франкаў у значэнні адасобленых феадалаў і феадальных адзінак тэрміны «граф» і «графства» распаўсюдзіліся на пераемныя дзяржавы.

Трэці этап у эвалюцыі тэрмінаў «граф» і «графства», які пачаўся ў XV ст., – «тытулярны». З заняпадам феадалізму і развіццём нацыянальных дзяржаў графствы, якія траплялі пад юрысдыкцыю цэнтральнага кіруючага апарата, натуральна, страцілі сваё значэнне як асобныя феадальныя адзінкі і трансфармаваліся ў буйныя маёнткі. Пад «графам» (роўна як і пад іншым тытулам) разумелася спадчыннае (або прысвоенае пажыццёва асобным людзям) ганаровае званне. Яно падкрэслівала асаблівае, прывілеяванае становішча носьбіта, што патрабавала адпаведнага тытулавання. У сувязі з гэтым у саслоўна-феадальным грамадстве Заходняй Еўропы сфармавалася складаная саслоўная іерархія, аснову якой складалі тытулы. Значэнне спадчынных тытулаў паступова ніveліравалася і яны саступалі месца дзяржаўным пасадам. На прыкладзе Святой Рымскай імперыі як краіны, з якой графскі тытул быў пераняты ў Вялікае Княства Літоўскае, разгледзім саслоўную іерархію тытулаў (у іншых краінах Заходняй Еўропы структура была падобная, але з некаторымі нязначнымі нацыянальнымі асаблівасцямі).

У Святой Рымскай імперыі існавала дзве тытульныя іерархіі, сістэма якой прадстаўленая на мал. 1. Тытулы падзяляліся на саслоўныя і імперскія (мелі свецкую і духоўную галіны).




*Мал. 1*. **Іерархія тытулаў Святой Рымскай імперыі**

На вяршыні саслоўнай лесвіцы знаходзіўся *імператар*. Адразу пасля імператара ў іерархіі кіравання стаяла саслоўе *фюрстаў* (Fürst), у якое ўваходзілі:

• герцаг (Herzog) – вышэйшы арыстакратычны тытул. Першапачаткова герцаг вызначаўся як ваенны правадыр, які абіраўся родаплемянной знаццю. У раннім Сярэднявеччы герцаг – буйны тэрытарыяльны валадар, які займае першае месца пасля караля ў ваенна-леннай іерархіі, якому падпарадкоўваліся графы. У перыяд феадальнай раздробленасці на чале герцагстваў, якія працягвалі захоўваць свае этнічныя асаблівасці, паўсталі найбуйнейшыя феадалы; у далейшым яны ператварыліся ў найбольш значных тэрытарыяльных валадароў;

• ландграф (Landgraf). Становішча ландграфаў было падобна да становішчам герцагаў: на іх ляжаў абавязак не толькі ў сваім графстве, але і ў больш шырокай вобласці падтрымліваць мір, а ў выпадку вайны даваць каму трэба ўзброенае прыкрыццё;

• маркграф (Markgraf) – кіраўнік пагранічнай зямельнай акругі (маркі). На сваіх тэрыторыях маркграфы мелі ўладу ўзроўню герцага, за адзіным выключэннем: падчас ваенных паходаў маркграфы ішлі за герцагскім сцягам;

• граф (Graf) – найбольш распаўсюджаны арыстакратычны тытул; уладар пэўнай адміністрацыйнай адзінкі. Да канца XV ст. у імперыі існаваў шэраг форм графскага тытула – Фрэйграф (Freigraf), Бургграф (Burggraf), Рэйнграф (Rheingraf), Альтграф (Altgraf), Вільдграф (Wildgraf), Раўграф (Raugraf) – якія ў больш позні час пачалі знікаць і канчаткова выходзіць з ужытку.

За саслоўем фюрстаў у іерархія змяшчаліся *фрайхеры* (Freiherr), якія даслоўна абазначалі «свабодных грамадзян» імперыі, адпавядаюць тытулу барон у іншых еўрапейскіх тытулярных сістэмах. За імі змяшчалася ваеннае землеўласніцкае саслоўе *рыцараў* (Ritter). Завяршаў арыстакратычную лесвіцу тытул *эдлер* (Edler) – дробныя ўладары спадчыннай зямлі [17].

Апроч тытулаў саслоўных, у Святой Рымскай імперыі існавалі тытулы імперскія, з якіх фарміравалася імперскае саслоўе, – суб'екты, якія валодалі правам голасу ў рэйхстагу. У сацыяльным плане імперскае саслоўе ўяўляла з сябе вышэйшае дваранства (пераважная большасць – прадстаўнікі саслоўя фюрстаў), вышэйшае духавенства і патрыцыят імперскіх гарадоў, якія ўтваралі ў сукупнасці найважнейшую сацыяльную базу імперыі. Права на прысваенне імперскага тытула меў імператар. У імперскае саслоўе ўваходзілі:

• курфюрсты (Kurfürsten) – вузкая група ўладароў найбольш магутных нямецкіх тэрытарыяльных адзінак, якія мелі выключнае права выбару імператара;

• імперскія князі (Reichsfürsten) – вышэйшае дваранства Святой Рымскай імперыі, у склад якога ўваходзілі ўладары тэрытарыяльных адзінак, якія мелі тытул, вышэй за графскі (былі выключэнні);

• імперскія графы (Reichsgrafen) – найбольш шматлікае імперскае саслоўе, якое ўтварала масу сярэдняга нямецкага дваранства, у склад якога ўваходзілі ў тым ліку і прадстаўнікі фрайхераў (баронаў). У склад імперскага графскага саслоўя ўваходзілі тыя графы і бароны, якія з'яўляліся суверэнамі невялікіх тэрытарыяльных адзінак, іншыя ж, якія заставаліся пад сюзерэнітэтам больш магутных фюрстаў, у кіраванні імперыяй не ўдзельнічалі.

Імперскае саслоўе падзялялася на свецкае і духоўнае, якое мела падобную іерархію. На вяршыні знаходзіліся духоўныя курфюрсты – архібіскупы, за імі ішлі духоўныя імперскія князі (князі-біскупы), пасля якіх стаялі імперскія прэлаты.

У склад імперскага саслоўя ўваходзілі не толькі персаналіі, але вылучаліся і асобныя тэрытарыяльныя адзінкі – свабодныя імперскія гарады, якія, у адрозненне ад іншых гарадскіх цэнтраў імперыі, не знаходзіліся пад сюзерэнітэтам тэрытарыяльных фюрстаў, а падпарадкоўваліся непасрэдна імператару і з'яўляліся самастойнымі дзяржаўнымі ўтварэннямі [18].

Імперская саслоўе было канчаткова сфарміравана ў пачатку XVI ст. Яго склад (канкрэтны пералік суб'ектаў імперыі) строга фіксаваўся імперскімі матрыкуламі, якія зацвярджаў рэйхстаг. Так, згодна з Вормскім матрыкулам 1521 г., у рэйхстаг уваходзіла 388 суб'ектаў імперыі (з іх 135 прыходзілася на духоўныя асобы, 85 – на свабодныя імперскія гарады). Свецкі склад рэйхстага выглядаў наступным чынам:

• курфюрсты: кароль Чэхіі, курфюрсты Пфальца, Саксоніі, Брандэнбурга;

• імперскія князі (32 суб'екты): кароль Даніі, эрцгерцаг Аўстрыі, 20 герцагаў, 3 князя, 2 ландграфы, 3 маркграфы, 1 граф, 1 бургграф;

• імперскія графы (132 суб'екты): 1 маркграф, 95 графаў, 2 бургграфы, 31 барон, 3 крайчых (прыдворная пасада; адказны за стольнікаў, якія падаюць ежу і напоі) [19, с. 313].

Так, у Святой Рымскай імперыі існавала складаная іерархія тытулаў, у якую уваходзілі і тытулы імперскія. Апошнія давалі іх носьбітам права голасу ў рэйхстагу. На дадзеным прыкладзе бачна, як адбылася трансфармацыя тытулаў у еўрапейскім грамадстве. Пры захаванні спадчынных саслоўных тытулаў большы ўплыў мелі тытула імперскія з канкрэтнымі палітычнымі правамі. З прыведзенага вышэй матрыкула бачна, што носьбіт, напрыклад, тытула «маркграф» у імперскім саслоўі мог быць прыналежным як да князя імперыі, так і да графа імперыі.

Такім чынам, тэрміны «граф» і «графства» прайшлі доўгую эвалюцыю, у выніку якой цалкам змяніўся іх змест і разуменне. Першапачаткова тэрмін «граф» з'яўляецца ў перыяд позняй Антычнасці і сустракаецца ў 312 г. н. э. пры апісанні дзяржаўнага апарата імператара Канстанціна І. У значэнні службовай асобы тэрмін «граф» сустракаецца і ў раннім Сярэднявеччы. У той жа час у Імперыі франкаў з'яўляецца тэрмін «графства» ў значэнні гаспадарча-адміністрацыйнай адзінкі, на чале якой стаяла службовая асо-

ба – граф, які ад імя манарха ажыццяўляў у межах гэтай адзінкі ўладныя функцыі. З наступленнем феадальнай раздробленасці ўмоўныя ўладанні (у тым ліку графствы) ператвараюцца ў спадчынныя феоды. Спадчыннымі становяцца і тытулы: граф з дзяржаўнага чыноўніка ператвараецца ў феадала, звязанага з манархам асабістай клятвай. З XV ст. у выніку зніжэння сацыяльнай мабільнасці насельніцтва Заходнееўрапейскіх дзяржаў набілітаванае саслоўе закрываецца. Адбываецца працэс структурызацыі: тытулы гуртуюцца ў адпаведнасці з уяўленнямі пра годнасць. Графствы трансфармаваліся ў буйныя маёнткі, а пад графам разумелася спадчыннае ганаровае званне. Менавіта ў такім разуменні тэрміны «граф» і «графства» трапляюць у Вялікае Княства Літоўскае. Сам тэрмін, які ў выніку прамога перакладу распаўсюдзіўся ў Княстве, запазычаны з нямецкай мовы ад слова «Graf», якое паходзіць ад сярэднелацінскага слова «graffio» і грэчаскага «γραφεύς» (grapheus).

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Кароткі гістарычны слоўнік беларускай мовы / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр дасслед. беларус. культуры, мовы і літ., Філ. «Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы»; склад. А. М. Булыка. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – 1038 с.

2. *Krüger, S.* Studien zur Sächsischen Grafschaftsverfassung im 9. Jahrhundert / S. Krüger. – Göttingen: Vandenhoeck & Ruprecht, 1950. – 97 s.

3. *Sprandel, R.* Dux und comes in der Merowingerzeit / R. Sprandel // Zeitschrift der Savigny-Stiftung für Rechtsgeschichte. Germanistische Abtheilung. –Wien; Köln; Weimar: Böhlau, 1957. – S. 41–84.

4. *Borgolte, M.* Die Grafen Alemanniens in merowingischer und karolingischer Zeit: Eine Prosopographie / M. Borgolte. – Sigmaringen: Thorbecke, 1986. – 341 s.

5. *Schulze, H.* Die Grafschaftsverfassung der Karolingerzeit in den Gebieten östlich des Rheins / H. K. Schulze. – Duncker und Humblot, 1973. – 389 s.

6. *Zotz, T.* Grafschaftsverfassung und Personengeschichte zu einem Werk über das karolingerzeitliche Alemannien / T. Zotz. – Stuttgart: Kohlhammer, 1988. – 16 s.

7. Monumenta Germaniae Historica. Legum nationum Germanicarum T. IV. P. I. – Hannoverae: Impensi Bibliopolii Hahniani, 1962. – 327 p.

8. Comes // The Oxford Dictionary of Byzantium. V. 1. – New York: Oxford University Press, 1991. – P. 484–485.

9. *Seeck, O.* Comes / O. Seeck // Paulys Realencyclopädie der classischen Altertumswissenschaft V. 4 – Stuttgart, 1900. – S. 629–679.

10. *Jones, A. H. M.* The Later Roman Empire, 284–602; a social, economic, and administrative survey. V. 1 / A. H. M. Jones. – Johns Hopkins University Press, 1986. – 1518 p.

11. *Bonfils, G.* Il comes et quaestor nell'età della dinastia costantiniana / G. Bonfils. – Napoli: Pubblicazioni della Facoltà giuridica dell'Università di Bari, 1981. – 227 p.

12. Капітулярый Карла Вялікага [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.le.ac.uk/hi/polyptyques/capitulare/latin.html. – Дата доступу: 13.12.2016.

13. Comte du palais // Carolingiens Encyclopédie. – Bibliothèque nationale de France [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.larousse.fr/encyclopedie/groupepersonnage/Carolingiens/111832#392608. – Дата доступу: 13.12.2016.

14. *Depreux, P.* Charlemagne et les Carolingiens, 687–987 Relié / P. Depreux. – Tallandier, 2002. – 160 p.

15. *Favier, J.* Charlemagne Relié / J. Favier. – Fayard, 1999. – 769 p.

16. Monumenta Germaniae Historica. Capitularia regum Frankorum T. II. – Hannoverae: Impensi Bibliopolii Hahniani, 1897. – 726 p.

17. Count // Encyclopædia Britannica Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.britannica.com/. – Дата доступу: 13.12.2016.

18. *Zoepfl, H.* Grundsätze des gemeinen deutschen Staatsrechts: mit besonderer Rücksicht auf das allgemeine Staatsrecht und auf die neuesten Zeitverhältnisse / Heinrich Zoepfl. – Leipzig: C. F. Winter, 1863. – 781 s.

19. *Zeumer, K.* Quellensammlung zur Geschichte der Deutschen Reichsverfassung in Mittelalter und Neuzeit / K. Zeumer. – Tübingen: J. G. B. Mohr (Paul Siebeck), 1913. – 614 s.

**(Дата падачы: 15.01.2018 г.)**

*Е. Н. Бухал*
Республиканский институт высшей школы, Минск
*A. Bukhal*
National Institute of Higher Education, Minsk

**УДК 94**

# ХРИСТИАНЕ, МАВРЫ, ИУДЕИ, ИСПАНЦЫ: ПОЛЕМИКА КАСТРО И САНЧЕСА ВОКРУГ ГЕНЕЗИСА ИСПАНСКОЙ НАЦИИ

# CHRISTIAN, MAURUS, JEWISH, SPANISH: CASTRO AND SANCHEZ POLICE CROSSROADS AROUND THE GENESIS OF THE SPANISH NATION

*Сложное переплетение отношений трех религиозных общин характеризует испанское Средневековье и отличает Испанию от других европейских стран. Арабское вторжение 711 года обособило её историческое развитие на семь столетий до тех пор, пока не произошло взятие Гранады христианами в 1492 г. Вопрос о том, как сосуществовали религиозные общины в Средние века на территории Испании и какой вклад внесла каждая из них в формирование испанского национального характера, привел в последней четверти XX века к развитию пылкой полемики, которая разделила не только испанский интеллектуальный мир, но даже рядовых испанцев на два лагеря, противостоящих друг другу непримиримым образом. Начало этой полемики положили работы А. Кастро и К. Санчес-Альборноса, основные тезисы которых рассмотрены в данной статье.*

*Ключевые слова: испанская историография; иудеи; мавры; христиане; история Испании; Средние века.*

*The intertwined relations of three religious communities characterize the Spanish Middle Ages and distinguish Spain from other European country. Spanish historical development was postponed for seven centuries by invasion in 711, until 1492 when Christians conquered Granada. There were questions «How did religious communes coexist in the Middle Ages on Spanish territories» and «What was contributed to the formation of Spanish national character». This questions caused beginning of polemic in last quarter of twentieth century, polemic separated not only intellectual world of Spain, but also separated ordinary citizens into two groups. A. Castro and C. Sanchez-Albornoz started this polemic, main thesis elucidate in the article.*

*Key words: Spanish historiography; jews; mussulman; christian, Spanish history, Middle Ages.*